CORE
Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
Provided by Repository of Belarusian National Technical University (BNTU)

# Мая сям'я ў гады вайны

*Мігай Ганна,* студэнтка групы 10205218, ФГДЭ
Кіраўнік ст. выкладчык *Н.М. Карбалевіч*

Вайна… Шмат чаго прыходзіць на розум, калі чуеш гэтае слова. Голад, смерці, пакуты. Шмат пакут з ўсіх бакоў чалавечага жыцця. 22 чэрвеня 1941 года, калі людзі мірна спалі, германскія войскі абрынулі на савецкія землі тысячы снарадаў і бомб. Адразу ж людзі пачалі сваю барацьбу супраць ворага. І толькі дзякуючы ўпартасці, гераізму, патрыятызму і ўзгодненнай рабоце савецкага народа вораг быў пераможаны.

Вайна закранула амаль кожнага чалавека ва ўсім Савецкім Саюзе. На бой з ворагам адразу пачалі прызывацца людзі розных узростаў, палоў і становішчаў. Таксама вайна закранула і маю сям'ю. У прыватнасці, значны ўдзел у вайне прымаў адзін з маіх прадзедаў, бацька майго дзеда па лініі маці, якога звалі Церахаў Іван Ільіч. Ён нарадзіўся ў 1915 годзе ў вёсцы Касцягаўка Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1939 годзе Іван паступіў у артылерыйскае вучылішча. Скончыў яго паскораным курсам перад вайной. У чэрвені 1941 года няўдала складваліся першыя дні вайны. Іх артылерыйскую батарэю разбілі і яму прыйшлося выходзіць з акружэння. Далей у адным з баёў пад Смаленскам ён атрымаў першае раненне асколкам гранаты. Але ж, на шчасце, прадзед ачуняў і вярнуўся ў дзеючую армію. Іван Ільіч умела камандаваў сваёй батарэяй і, дзякуючы яго намаганням, яна магла дапамагаць нашым пяхотным падраздзяленням у баі. За гэта ён у тым жа 1941 годзе атрымаў сваю першую ўзнагароду. Гэта была медаль "За баявыя заслугі".

1 кастрычніка 1943 года быў вызвалены Краснапольскі раён Магілёўскай вобласці, а значыць, і родная вёска майго дзеда – Касцягаўка. Калі ён прыйшоў у родную хату, яго родныя былі вельмі шчаслівыя, што ўбачылі свайго сына, унука, брата. Яго малодшы брат, Валодзя, якому было 15 гадоў, стаў вельмі прасіцца пайсці з братам на фронт. Сям'я вырашыла адпусціць хлопца разам з Іванам. У адным з баёў хлопец загінуў. Прадзед Іван заўсёды вінаваціў сябе за смерць любімага брата, а калі расказваў гэта майму дзядулі, заўсёды плакаў. Далей прадзед прымаў удзел у бітве за Дняпро ў 1943 годзе. Фарсіраванне Дняпра – адзін з самых значных

баёў на тэрыторыі БССР, які прынёс шмат страт, але ж і вялікі вынік. Яно пачалося ў жніўні 1943 года. Пасля правала аперацыі "Цытадэль" гітлераўскае вярхоўнае камандаванне вырашыла перайсці на ўсім усходнім фронце да абароны і моцна трымаць занятыя пазіцыі. Гітлераўцы пачалі ўмацоўваць правы бераг Дняпра, дзе былі адны з самых значных абарончых збудаванняў Германіі. Высокі бераг, на якім замацаваліся ворагі, паводле іх меркавання, павінен быў стаць непераадольнай перашкодай для савецкіх войскаў. "Хутчэй Днепр паплыве ў іншы бок, чым рускія пераадолеюць яго" – гаварыў Гітлер. Але савецкія войскі ў снежні 1943 года змаглі фарсіраваць гэтую перашкоду ворага і вызвалілі большую частку Украіны. Падчас баёў мой прадзед атрымаў асколачнае раненне ў шыю. Усе думалі, што ён памрэ, але дзякуючы добрай працы лекараў Іван Ільіч выжыў. Доўгі час ён лячыўся і потым цалкам акрыяў. За удзел ў фарсіраванні Дняпра прадзед быў узнагароджаны ордэнам Айчынай вайны першай ступені, а потым за баі пад Берлінам і ордэнам Айчынай вайны другой ступені. Ён таксама прымаў удзел у Кёнігсбергскай аперацыі. "Кёнігсберг – крэпасць, якую рускім ніколі не ўзяць" – гаварылі немцы аб ёй, але чырвонаармейцы ўзялі за некалькі дзён, 6-9 красавіка 1945 года. Было забіта і ўзята ў палон шмат немцаў. За актыўны ўдзел у Кёнігсбергскай аперацыі і ўмелае кіраўніцтва Іван Ільіч атрымаў медаль "За ўзяцце Кёнігсберга". Вайну ён скончыў у Берліне, за што быў узнагароджаны, акрамя ордэна Айчыннай вайны другой ступені, таксама і медалём "За ўзяцце Берліна". Ужо пасля вайны прадзед атрымаў вельмі высокую ўзнагароду – ордэн Аляксандра Неўскага.

Як адзначана ў наградным лісце, "капітан Церахаў у баях ва Ўсходняй Прусіі, падтрымлівая агнём артылерыі наступленне стралковых падраздзяленняў, знішчыў 17 кулямётных кропак ворага, каля батальёна нямецкіх салдат і афіцэраў, падавіў агонь трох артылерыйскіх батарэй.

Пазней, асабіста карэктыруя агонь 76-міліметровых пушак, знішчыў 2 кулямёты і 14 салдат і афіцэраў праціўніка".

У мірны час мой прадзед працаваў у ваенкамаце, скончыў партыйную школу. Працаваў у адной з сярэдніх школ Расіі ваенным кіраўніком. Памёр ў 1981 годзе.

Такім чынам, мой прадзед зрабіў вялікі ўклад у барацьбу з ворагам і меў шмат узнагарод і падзячных лістоў. Таксама ў інтэрнэце я знайшла наградны ліст і спіс узнагароджаных ордэнам Аляксандра Неўскага, дзе можна ўбачыць і імя майго прадзеда – Церахава Івана Ільіча.

Ваенны лёс іншых членаў маёй сям'і не такі складаны і менш вядомы. Маці майго дзеда, Церахава Надзея, жонка Івана Церахава, у гады вайны жыла ў акупацыі, у Краснаполлі. Калі немцы адступалі з Краснапольскага раёну, яны ўсё спальвалі на сваім шляху і забіралі людзей, каб адправіць іх у Германію. Але яна схавалася ад іх і яе не кранула сумная доля. Пасля вайны жыла на хутары ў сваёй цёткі бліз Краснаполля.

Другая мая прабабуля, Леановіч Зінаіда Сямёнаўна, таксама жыла ў акупацыі. Ёй пашанцавала, калі можна так сказаць, бо немцы, якіх сустракала яна ў акупацыі, былі не жорсткімі і паводзілі сябе "як людзі". Яны частавалі маю прабабулю салодкім, дапамагалі яе сям'і па гаспадарцы, давалі адзёжу, не адбіралі ежу. І яна магла гуляць са сваімі сябрамі па вёсцы і не баяцца трапіцца ім на вочы.

Бацька маёй бабулі, Леановіч Іван Іванавіч, пайшоў на вайну у 1943 годзе. З вайны ён вярнуўся жывы. Ён не мае узнагарод, але ж таксама прымаў удзел у баях супраць гітлераўцаў.

Пра прадзеда па бацькоўскай лініі, Сяўчэню Нічыпара Кандрацьевіча, вядома няшмат. Ён не вярнуўся з вайны.

Такім чынам, вайна – самае страшнае, што можа здарыцца з народам. Яна прыносіць толькі дрэннае: смерці, хваробы, голад, слёзы, кроў і шмат іншых пакут. Але калі ж вайна ўсё роўна прыйшла, заўсёды павінны быць людзі, якія будуць абараняць Радзіму, якія пакажуць ворагу, чыя гэта зямля. Павінны быць героі, якія не пашкадуюць свайго жыцця дзеля будучыні сваёй краіны і сваёй сям'і, дзяцей, унукаў. І я з гонарам магу сказаць, што і ў маёй сям'і ёсць такія героі. Героі Вялікай Айчынай вайны, якія ўнеслі і свой ўклад у барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, перажылі вайну, тым самым разам са сваімі таварышамі забяспечылі маё жыццё. Наша жыццё. Жыццё майго народа. І менавіта дзякуючы ім, вядомым і невядомым героям-салдатам мы можам хадзіць па зямлі, дыхаць паветрам, піць ваду, харчавацца смачнай ежай, кахаць і шчасліва жыць разам са сваёй сям'ёй.